ня 8 гадоў) сталі асн. тыпам сярэдніх навуч. устаноў у Рас. імперыі; у 1872 рэальныя Г. пераўтвораны ў рэальныя вучылішчы. У 2-й пал. 19 ст. з'явіліся жаночыя Г., у пач. 20 ст. актыўна ствараліся прыватныя Г. На 1.1.1915 на тэр. Беларусі дзейнічалі 14 дзярж. і 5 прыватных мужчынскіх, 17 дзярж. і 23 прыватныя жаночыя Г. Пасля Лют. рэв. 1917 стала магчымай арганізацыя нац. школ, адкрылася Слуцкая бел. Г. На сав. тэр. Беларусі Г. скасаваны ў кастр. 1918. У Зах. Беларусі ў 1917—21 былі адчынены прыватныя Будслаўская, Віленская, Клецкая, Навагрудская, Нясвіжская, Радашковіцкая бел. Г. Да 1936 амаль усе бел. Г. былі закрыты польск. уладамі (Віленская Г. існавала да 1939). У Гродне, Навагрудку, Брэсце і інш. гарадах у 1921—39 дзейнічалі польск. Г. У канцы 1980-х — пач. 1990-х гг. у Беларусі зноў пачалі стварацца Г. У 1990/91 навуч. годзе ў рэспубліцы дзейнічала 12 Г., у 2009/10 — 213 (у т.л. 199 у гарадах і пасёлках гар. тыпу, 14 у сельскіх нас. пунктах), у якіх адукацыю атрымлівалі 132,2 тыс. навучэнцаў. Сучасная Г. — сярэдняя агульнаадукац. ўстанова з пашыранай навуч. праграмай і паглыбленым вывучэннем асн. дысцыплін. У старэйшых класах ажыццяўляецца спецыялізацыя па грамадска-паліт., фізіка-матэматычным, хіміка-біял. і інш. кірунках. *А.Ф.Самусік.*

**ГІНЦБУРГ** Аляксандр Ільіч (1.3.1907, г. Рагачоў — 15.11.1972), беларускі кінааператар, кінарэжысёр. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1955). Засл. дзеяч мастацтваў Расіі (1969). Скончыў Ленінградскі электратэхн. ін-т (1934). Працаваў на к/студыях Расіі. У 1948—58 на к/студыі «Беларусьфільм». Аператар маст. фільмаў «Канстанцін Заслонаў» (1949), «Паўлінка» (1952), «Пяюць жаваранкі» (1953), «Хто смяецца апошнім» (1954), маст. кіраўнік кінастужкі «Беларускі канцэрт» (1956) і інш.

**ГІПЕ́РБАЛА** (ад грэч. hyperbolē перабольшванне), мастацкі прыём,



*А.І.Гінцбург.*

заснаваны на перабольшанні асобных уласцівасцей чалавечага характару, якасцей ці памераў прадмета або з'яў з мэтай паэт. ідэалізацыі. Характэрна для эпічнай паэзіі. Шырока выкарыстоўваецца ў фальклоры. Г. ўжываюць у творах рамантычнай л-ры для падкрэслівання ці ўзмацнення незвычайнасці характараў герояў, падзей і абставін у іх маст. уяўленні («Машэка гэтакі асілак, // Што рваў дзярэўе з каранём...» — Я.Купала. «Магіла льва»). У творы Г. выступае сродкам выяўлення аўтарскіх адносін да тых з'яў рэчаіснасці, што адлюстроўваюцца ў ім. Можа ўжывацца не толькі ў сваёй «чыстай» форме, але і ў выглядзе гіпербалізаваных метафар, эпітэтаў, параўнанняў. Процілеглы Г. троп — *літота.*

*Т.У.Ганчарова-Цынкевіч.*

**ГІПЕРДАКТЫЛІ́ЧНАЯ РЫФМА**, від чатырохскладовай рыфмы, калі націск у сугучных словах прыпадае далей, чым на 3-і склад ад канца:

Ты бярозка не цярэбленая,
Твае сучайкі сярэбраныя.

(Бел. нар. песня)

Г.р. ў бел. л-ры ўпершыню выкарыстаў М.Багдановіч («Скірпуся»): «Ўтаргавала селязня, / Селязенька чубаценькага, / Маладога, зухаваценькага». У бел. паэзіі Г.р. ўжываецца ў спалучэнні з мужчынскай і жаночай рыфмамі ў вершах розных жанраў:

Прабягае дзе-нідзе
Злосны вецер за аселіцаю.
І зімы апошні дзень
Апяваецца мяцеліцаю.

І сівы мароз мастак
Парасклаў на шыбе папараці.
Кветкі снежныя, аднак,
Заўтра кроплямі закапаеце...
(Р.Крушына)

*І.М.Гоўзіч.*